# Прадмова да беларускага выдання

Аўтару гэтых радкоў пашчасціла тройчы падрабязна пазнаёміцца з даследаваннем, праведзеным нямецкім гісторыкам Аляксандрам Бракелем. У верасні 2006 г. яно мела форму пераплеценага рукапісу дысертацыі ў чатыры з паловай сотні старонак, атрыманага ў якасці дарунку падчас сустрэчы ў Берліне. Тады малады даследчык толькі што паспяхова абараніў гэтую дысертацыю ва ўніверсітэце імя Ёгана Гутэнберга ў Майнцы і здабыў акадэмічную ступень доктара навук. Другое знаёмства адбылося праз тры гады, калі дысертацыя пабачыла свет ужо ў выглядзе грунтоўнай кнігі, выдадзенай Цэнтрам ваенна-гістарычных даследаванняў у Патсдаме ў якасці чарговага (пятага) тома серыі «Эпоха сусветных войнаў» у добра вядомым у Нямеччыне і за яе межамі выдавецтве «Ferdinand Schöningh». Трэцяе прачытанне «фундаментальнага даследавання», як яго ахарактарызаваў у прадмове кіраўнік згаданага вышэй патсдамскага Цэнтра палкоўнік, доктар Ганс Элерт, было звязана з навуковым рэцэнзаваннем[1]. Цяпер на парадку дня стаіць чарговае навуковае спатканне з працай Аляксандра Бракеля. І сустрэча гэта не шараговая, а асаблівая.

Выступіць не столькі навуковым экспертам даследавання, колькі яго папулярызатарам для беларускага чытача — з аднаго боку, даволі простая, а, з другога, надзвычай адказная справа. Прадставіць гэтую грунтоўную працу падаецца простым па той прычыне, што беларускага чытача чакае адно з малавядомых, грунтоўных і арыгінальных даследаванняў, датычнага добра вядомага з айчыннай гістарыяграфіі перыяду — гісторыі Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны. У той жа час пастаўленая задача вымагае ад аўтара гэтых радкоў новага, узважанага асэнсавання вынікаў гэтай працы, якая ўжо некалькі год вядома нямецкім чытачам, навуковай ацэнкі яе зместу і вызначэння яе аб’ектыўнага значэння ў кантэксце цяперашняй айчыннай і замежнай гістарыяграфіі.

Хацелася б звярнуць яго ўвагу на некалькі прынцыпова важных момантаў, што адразу могуць не кідацца на вочы пры прачытанні кнігі. Найперш неабходна ўзгадаць пра ўнікальны навуковы кантэкст, у рамках пісалася праца. Па-першае, яе аб’ектам нямецкі гісторык вызначае

---

[1] Электронны рэсурс: http://www.belhistory.eu/brakel-alexander-unter-rotem-stern-und-hakenkreuz-baranowicze-1939—bis-1944—syargej-novika%D1%9E/. Дата доступу: 18.12.2016; Новікаў С. [Рэцэнзія]. Беларускі гістарычны агляд. Т. 16. Сшытак 2 (31). Снежань 2009. С. 647—658. Рэц. на кн.: Brakel Alexander. Unter Rotem Stern und Hakenkreuz. Baranowicze 1939 bis 1944. Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2009. 426 S. Новікаў С. [Рэцэнзія]. Ваенная Беларусь у найноўшых нямецкіх даследаваннях // Беларускі гістарычны часопіс. 2010. № 11. С. 17—26.

толькі адзін з рэгіёнаў Заходняй Беларусі — Баранавіцкую вобласць БССР (з канца 1939 па чэрвень 1941 г.) ці Баранавіцкую акругу Генеральнай акругі Беларусь (з верасня 1941 па ліпень 1944 г.). Па-другое, праца на прыкладзе гісторыі аднаго з рэгіёнаў Беларусі закладае новы для беларускай гістарычнай навукі тэарэтыка-метадалагічны падмурак для паглыбленага вывучэння падзей ваеннай штодзённасці цывільнага насельніцтва. Па-трэцяе, работа вылучаецца адметным канцэптуальным падыходам — правядзеннем кампаратыўнага аналізу гістарычных падзей на працягу не столькі кароткага перыяду часу, колькі ў кантэксце параўнання прынцыпова розных па характары, часе і змесце сацыяльных феноменаў. Па-чацвёртае, даследаванне А.Бракеля ўяўляе яскравы прыклад новага даследчыцкага напрамку сучаснай германскай гістарыяграфіі — вывучэння гісторыі ваеннай штодзённасці не столькі ў рэгіянальным, колькі ў лакальным кантэксце. Па-пятае, адметнасць працы ў тым, што ў аснове яе ляжыць аналіз дакументальных крыніц з 84 фондаў беларускіх, нямецкіх і польскіх архіваў. Увядзенне такога масіву дакументаў у навуковы зварот значна ўзбагачае беларускае гістарычнае крыніцазнаўства.

Перш чым прапанаваць беларускаму чытачу некаторыя назіранні і высновы ў дачыненні да зместу беларускамоўнага перакладу кнігі, хацелася б нагадаць яшчэ адзін істотны даследчыцкі момант, без якога не было б такой кнігі. Аляксандр Бракель у самым пачатку працы над тэмай пераконваў беларускіх калег у важнасці выкарыстання новых метадалагічных падыходаў для даследавання супярэчлівай і дыскусійнай ваеннай гісторыі Беларусі ў рэгіянальным і лакальным вымярэнні. З самага пачатку нямецкі даследчык бачыў перспектыву ў канцэптуалізацыі гістарычных падзей з улікам іх рэгіянальных асаблівасцяў, у паглыбленай распрацоўцы абмежаванага тэматычнага поля пры дапамозе дакументальных крыніц самага living рознага паходжання. Гэта было асабліва адметным на фоне таго, што ў савецкай, а таксама ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі ваенная гісторыя Беларусі вылучалася стандартнымі характарыстыкамі і традыцыйнымі навуковымі падыходамі. Як адзначае аўтар, яго даследаванне працягвае тую працу, якую ў 1990—я гады распачаў на шырокім беларускім матэрыяле Бернгард К’яры — нямецкі першапраходзец у даследаванні гісторыі ваеннай штодзённасці ў Беларусі 1941—1944 гг. Таму можна з упэўненасцю сцвярджаць, што перад намі першы ў навуковай традыцыі вопыт прадстаўлення лакальнай гісторыі Баранавіцкай вобласці (і акругі) як прадмета спецыяльнага гістарычнага даследавання.

Калі беларускі чытач адгорне старонкі гэтай кнігі, ён услед за аўтарам зможа рушыць па выспах невядомай тэорыі і лакальнай гісторыі перадваеннай і ваеннай Беларусі на прыкладзе Баранавіччыны ў 1939—1944 гг. Як жа належыць успрымаць чытачу такую дваякую скіраванасць, якімі крытэрыямі кіравацца? Гэтыя і іншыя нечаканыя пытанні пастаянна будуць з’яўляцца пры чытанні кнігі. Такі падыход робіць больш выразнымі перадваеннае і ваеннае мінулае Баранавіцкай

вобласці/ акругі, якое з верасня 1939 па ліпень 1944 г. вызначалі падзеі савецкай анексіі (і саветызацыі) і германскай акупацыі. Аўтар манаграфіі прыходзіць да высновы, што ў 1939—1944 г. цывільнае насельніцтва Баранавіцкай вобласці/акругі знаходзіліся ў фокусе антаганістычных светапоглядаў дзвюх уладных сістэм і перажыло цяжкія наступствы іх панавання. Разглядаючы сітуацыю мясцовага насельніцтва ва ўмовах панавання антаганістычных уладных сістэм цягам пяці гадоў, аўтар шукае адказы на пытанні: 1) якімі стратэгіямі выжывання кіравалася цывільнае насельніцтва; 2) хто імкнуўся да ўздыму супрацыву, а хто да супрацы з акупантамі; 3) якія канфлікты існавалі сярод насельніцтва, у першую чаргу паміж беларусамі, палякамі, яўрэямі, а таксама рускімі і ўкраінцамі, і ці залежалі яны ад яго нацыянальнай прыналежнасці. У такім ракурсе гэтая праблематыка да гэтага часу спецыяльна не разглядаліся не толькі ў нямецкай, але і ў беларускай гістарыяграфіі.

Грунтоўны аналіз і сістэматызацыя вялікага корпусу дакументальных крыніц дазволілі аўтару прайсці да важных высноў адносна тыповасці ці, наадварот, непаўторнасці пэўных мадэляў, практык, стратэгій выжывання цывільнага насельніцтва на тэрыторыі Баранавіччыны, падкантрольнай спачатку савецкай уладзе (з восені 1939 і да чэрвеня 1941 г.), а потым германскай цывільнай адміністрацыі (з верасня 1941 па ліпень 1944 г.). Чытач мае рэальную магчымасць на дакладных фактах самастойна вызначыць і параўнаць адметнасці штодзённага жыцця цывільнага насельніцтва Тым самым аўтар паказвае, што рэканструкцыя гісторыі штодзённага жыцця цывільнага насельніцтва таго перыяду выходзіць за рамкі традыцыйных характарыстык, вымагае новых падыходаў і адэкватных навуковых ацэнак, больш глыбокага вывучэння стратэгій і практык выжывання мірнага чалавека.

У пачатку кнігі (раздзел II) А. Бракель раскрывае моўныя і канфесійныя адметнасці мясцовага насельніцтва. Аўтар абгрунтоўвае тэзу, што ў 1930-я гады нацыянальная прыналежнасць мясцовага польскага і беларускага насельніцтва Навагрудскага ваяводства не была пастаяннай, тады як у мясцовых яўрэяў такіх ваганняў не назіралася. Правядзеннем дыскрымінацыйнай палітыкі ў дачыненні да беларускай меншасці польскія ўлады садзейнічалі «абвастрэнню грамадскага клімату». Ужо знаёмства з гэтым раздзелам кнігі пераконвае чытача, што яна пабудавана не толькі на глыбокім аналізе шырокага кола дакументальных крыніц, але і на адэкватнай навуковай ацэнцы гістарычных падзей.

У трэцім раздзеле аўтар знаёміць чытача з геаграфіяй прадмета даследавання. У верасні 1939 г. на месцы былога Навагрудскага ваяводства ўзнікла Баранавіцкая вобласць (у студзені 1940 г. у яе былі ўключаны 27 раёнаў БССР); з верасня 1941 г. тэрыторыя Баранавіцкай акругі налічвала 7 раёнаў — Навагрудскі, Клецкі, Ляхавіцкі, Мірскі, Нясвіжскі, Навамышскі, Стаўбцоўскі і Баранавіцкі. На пяць гадоў мясцовае цывільнае насельніцтва апынулася ў віры «радыкальнай трансфармацыі».

У наступным раздзеле аўтар знаёміць чытача з нацыянальнай палітыкай і нацыянальнымі канфліктамі ў 1939—1944 гг. на Баранавіччыне. Адразу пасля ўсталявання савецкага панавання былі распачаты акты гвалту ў дачыненні да асобнай часткі грамадства —«старой польскай эліты», якая разглядалася ў якасці «класавага ворага». Дэпартацыям падлягала насельніцтва, якое раздзяляла розныя палітычныя перакананні, мела розны сацыяльны статус і этнічнае паходжанне. Пры гэтым асноўную масу дэпартаваных складалі палякі, а не яўрэі і беларусы. У кадравай палітыцы савецкая ўлада прытрымлівалася прынцыпу прыцягнення на новаўтвораныя пасады выхадцаў з Усходняй Беларусі і з Расіі — усходнікаў. Асаблівая ўвага надавалася адукацыйнай сістэме, бо бальшавікі хацелі праз школьную палітыку ўплываць на культуру карэннага насельніцтва, якое асабліва пацярпела за польскім часам; разгляд яўрэяў як «савецкіх калабарантаў» з'яўляецца не больш чым стэрэатыпам. Даследчык дапускае існаванне пэўных канфліктаў паміж нацыянальнымі групамі ў гады савецкага панавання (1939—1941) у сувязі з падзелам грамадства на пераможцаў і пераможаных, прыхільнікаў і праціўнікаў новага парадку. Лінія падзелу пры гэтым праходзіла ў значнай ступені ўздоўж сацыяльных крытэрыяў. Пагаршэнне жыццёвых умоў даволі хутка прывяло да сітуацыі, калі першапачатковае захапленне савецкай уладай пачало зніжацца сярод як часткі беларускага, так і яўрэйскага насельніцтва.

У гэтым жа раздзеле А. Бракель разглядае нацыянальную палітыку нямецкіх акупантаў у дачыненні да мясцовага цывільнага насельніцтва ў 1941—1944 гг. Нямецкія нацыянал-сацыялісты ставіліся да нацыянальнага пытання інакш, чым бальшавікі: калі апошнія на словах выступалі за роўнасць усіх народаў, дык ідэолагі нацыянал-сацыялізму вызначалі ролю кожнага народа ў адпаведнасці з расавай тэорыяй. Нацысцкая нацыянальная палітыка была ў тысячу разоў горшай за адпаведную палітыку савецкай улады. Гаворачы аб стаўленні мясцовага насельніцтва да падзеяў Халакосту, аўтар мяркуе, што даволі складана даць адзіную абагульняючую ацэнку ў дачыненні да пазіцыі неяўрэйскага насельніцтва да лёсу яўрэяў. За часам нямецкай акупацыі антысемітызм сярод мясцовага насельніцтва не развіўся да такой меры, каб стаць фактарам, які б спрыяў працэсу вынішчэння яўрэяў. На матэрыяле Баранавіцкай акругі паказваецца, што ў немцаў фактычна не існавала адзінай пазіцыі адносна палякаў і беларусаў, хоць ужо на пачатку 1942 г. палякі былі выдаленыя практычна з усіх вядучых пасад на ўзроўні мясцовага кіравання, а іх месцы занялі беларусы. Аўтар сведчыць аб фактычнай адсутнасці «вялікіх нацыянальных канфліктаў» паміж цывільным насельніцтвам. Тыя ж канфлікты, якія ўсё ж такі мелі месца ў адносінах паміж палякамі і беларусамі, вынікалі з сацыяльных ці рэлігійных праблем.

У пятым раздзеле працы гаворыцца пра формы супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва з савецкай і германскай уладамі. І савецкая, і нямецкая ўлады імкнуліся здабыць падтрымку сярод насельніцтва.

Пры гэтым аўтар свядома не выкарыстоўвае тэрмін «калабарацыя», уводзячы замест гэтага такія дэфініцыі, як супрацоўніцтва і кааперацыя. Разглядаючы формы супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва з савецкай уладай, аўтар падзяляе гэтую сферу на некалькі праблемных палёў, дзе магло адбывацца ўзаемадзеянне. У выніку атрымлівалася шырокая панарама рознага роду супрацоўніцтва ў палітычнай, адміністрацыйнай і гаспадарчай сферах жыцця.

На думку аўтара, усталяванне нямецкай акупацыйнай улады стала для значнай часткі насельніцтва вяхой, з якой звязваліся надзеі на спыненне прымусовага прыцягнення сялян у калгасы, ганенняў вернікаў, закрыцця цэркваў і касцёлаў. Але ў хуткім часе мясцовае насельніцтва было вымушана пайсці на прымусовую кааперацыю і з нямецкай уладай. Што ж прывяло частку мясцовых да добраахвотнага супрацоўніцтва, аўтару вызначыць да канца не ўдалося па прычыне недахопу дакументальных крыніц.

Аўтар не абыходзіць увагай і саўдзел у злачынствах тых мясцовых жыхароў, хто пайшоў служыць у мясцовую дапаможную паліцыю, якая мела непасрэднае дачыненне да многіх зверстваў, учыненых падчас нямецкай акупацыі на тэрыторыі Баранавіцкай акругі. Больш за тое, аўтар спрабуе раскрыць прычыны таго, чаму мясцовае насельніцтва ішло на нямецкую службу. Адначасова з ростам актыўнасці партызан, якая ўзмацнілася з сярэдзіны 1942 г., таксама значна ўзраслі шэрагі паліцэйскіх фарміраванняў. Аднак у параўнанні з першым годам нямецкай акупацыі ў паліцыю перасталі ісці добраахвотнікі, таму немцам даводзілася звяртацца да мераў прымусовага рэкрутавання.

Адносіны беларускіх нацыяналістаў з акупантамі раскрываюцца на прыкладах супрацоўніцтва нямецкай акупацыйнай улады і такіх структур, як «Беларуская народная самапомач», «Беларускі корпус самааховы», «Саюз беларускай моладзі», «Беларуская цэнтральная рада», «Беларуская краёвая самаабарона». Пры гэтым прыводзяцца шматлікія дакументальныя звесткі аб удзеле ў гэтых структур жыхароў Баранавіцкай акругі.

Пад нямецкай акупацыяй колькасць тых, хто вымушаны быў пайсці на «прымусовае супрацоўніцтва» ў сферы гаспадаркі, значна перавышала лічбу мясцовых ураджэнцаў, хто нёс службу ў паліцыі аховы ці працаваў у органах мясцовага кіравання. Карціна прыцягнення мясцовага насельніцтва да прымусовай працы была наступнай. Усяго немцам удалося дэпартаваць у рэйх з акругі ўвогуле каля 17 тысяч чалавек (што складала 14% ад вывезеных на прымусовыя работы з тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь), пры гэтым у канцы 1943 г. на тэрыторыі Баранавіцкай акругі было зарэгістравана 134 тысячы рабочых, з якіх 95 тысяч былі заняты ў сельскай гаспадарцы. З гэтага аўтар выводзіць, што нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці фактаў аб добраахвотным супрацоўніцтве часткі насельніцтва з савецкай і нямецкай уладамі, немцы значна шырэй выкарыстоўвалі цывільнае насельніцтва на прымусовых працах, чым Саветы.

Самы вялікі па памерах раздзел кнігі прысвечаны аналізу форм незадавальнення, непрыняцця і супраціву з боку мясцовага насельніцтва. Супастаўляючы некаторыя факты непрыняцця савецкай улады і арганізаванага супраціўлення ёй на тэрыторыі новаўтворанай Баранавіцкай вобласці, а таксама параўноўваючы іх з маштабам партызанскай вайны на гэтай зямлі з нямецкім акупантам, аўтар прыходзіць да высновы: у гады германскай акупацыі маштаб узброенага супраціву непараўнальна вырас. Пасля захопу германскімі акупантамі тэрыторыі Баранавіцкай вобласці масавае незадавальненне выразілася ў разгортванні савецкага партызанскага руху. Партызанская вайна на тэрыторыі Баранавіцкай акругі стала сімвалічным знакам перыяду германскай акупацыі. Аўтар згадвае таксама пра стварэнне першага яўрэйскага атрада пад кіраўніцтвам братоў Бельскіх. Пры гэтым на дакументальных фактах аспрэчвае думку, якая пануе ў беларускай гістарыяграфіі, маўляў, ужо летам 1942 г. існаваў «маналітны, скаардынаваны і баяздольны рух савецкага супраціўлення».

З восені 1942 і да пачатку 1943 г. не толькі павялічылася колькасць партызан, узмацнілася іх баяздольнасць, але і сам савецкі партызанскі рух стаў лепей каардынавацца з цэнтру. У той жа час на тэрыторыі Баранавіцкай акругі ўзнік альтэрнатыўны рух супраціву — польскае ўзброенае падполле Арміі Краёвай. Хаця і савецкія партызаны, і польская Армія Краёва бачылі сваім галоўным ворагам германскіх акупантаў, палітычная будучыня і тэрытарыяльны лёс Баранавіччыны ў пасляваенны час імі бачыўся па-рознаму. Удзельнікі польскага руху супраціву дабіваліся адраджэння Польшчы ў межах 1939 года, савецкі ж бок бачыў Заходнюю Беларусь толькі ў складзе БССР. Пачынаючы з другой паловы 1943 г. відавочным фактам станавілася ўзмацненне напружанасці паміж савецкім партызанскім рухам і атрадамі Арміі Краёвай. У далейшым гэта вылілася ў зацятую ўзброеную барацьбу паміж савецкімі і польскімі партызанамі. Узброеная напружанасць паміж імі захоўвалася практычна да канца германскай акупацыі Баранавіччыны. На тэрыторыі Навагрудскай акругі часці Арміі Краёвай заставаліся моцным і баяздольным узброеным кулаком польскага падполля. Разам з тым, Баранавіцкая акруга была адным з наймацнейшых цэнтраў савецкай партызанкі на тэрыторыі Беларусі ў гады германскай акупацыі.

Не абыйдзена ўвагай у кнізе і тэма адносін паміж партызанскім рухам і мясцовым мірным насельніцтвам. Аўтар імкнецца выявіць тыя стратэгіі паводзін, якія садзейнічалі яго выжыванню ва ўмовах ваеннай штодзённасці на тэрыторыі Баранавіцкай акругі, калі яго лаальнасці дабівалася і савецкае ўзброенае супраціўленне, і Армія Краёва, і германскі акупацыйны рэжым.

Заключная частка кнігі прадстаўляе чытачу высновы праведзенага даследавання, у фокусе якога было жыццё цывільнага насельніцтва ва ўмовах панавання двух рэжымаў — спачатку савецкага, потым германскага. Большасць жыхароў не адчувала сябе звязанымі ні з савецкай, ні з польскай дзяржавамі. Савецкая палітыка насіла рысы «маналітнасці»,

паколькі мясцовыя ўлады выконвалі ўказанні Мінска і Масквы, тады як нацысцкая палітыка была менш паслядоўная, паколькі ажыццяўлялася рознымі органамі (вермахтам, цывільнай адміністрацыяй, паліцыяй). Аднак галоўныя адрозненні палягалі ва ўмовах, у якіх дзейнічалі савецкія і германскія ўлады: немцы праводзілі сваю палітыку ва ўмовах працяглай, жорсткай і стратнай вайны, тады як савецкая ўлада дзейнічала пры мірных абставінах. У час германскай акупацыі мясцовае насельніцтва знаходзілася ва ўмовах напружанага трохкутніка: нямецкай акупацыйнай улады і дзвюх антаганістычных падпольных груп — савецкага партызанскага руху і польскага ўзброенага супраціўлення. Такая ваенная штодзённасць садзейнічала істотнаму расколу цывільнага грамадства.

Гэтыя і іншыя думкі, разважанні, ацэнкі чытач сустрэне на старонках кнігі. Пасля яе кароткага прадстаўлення важна заўважыць, што з гэтага часу настае самы важны момант — пачынаецца асабістае знаёмства чытача з зусім няпростым зместам, фактамі, высновамі грунтоўнага даследавання, якое дапамагае нам спасцігнуць малавядомую дагэтуль лакальную карціну штодзённага жыцця цывільнага насельніцтва Беларусі ў 1939—1944 гг.

Пад канец не пабаюся выказаць думку, што як для гісторыкаў-аматараў, так і для гісторыкаў-прафесіяналаў, якія даследуюць ваенную мінуўшчыну, гэта праца стане настольнай кнігай. І яна, без усялякага сумневу, будзе служыць справе новага навуковага асэнсавання беларускіх падзей гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

*Сяргей Новікаў*
*Мінск, снежань 2016 — студзень 2017 г.*

# Прадмова

Усходнія тэрыторыі міжваеннай Польшчы, *усходнія крэсы*, як іх звалі палякі, падчас Другой сусветнай вайны зведалі змену розных акупацыйных рэжымаў — з рознымі арміямі, партызанамі і іншымі групоўкамі грамадзянскай вайны. Усе яны прэтэндавалі на ўладу і мелі сваю ідэалогію. *Крэсы* спачатку былі анексаваны Чырвонай арміяй у выніку гітлераўска-сталінскага пакта, з 1941 па 1944 г. там панавала нямецкая акупацыя, а затым зноў адбылася саветызацыя.

На прыкладзе горада Баранавічы і яго наваколля ў аднайменнай адміністрацыйнай адзінцы (*вобласці*) пасляваеннай Беларусі гэтая праца даследуе ўспрыманне мясцовым насельніцтвам гэтых дзвюх акупацыйных улад. Баранавічы месцяцца на палове шляху паміж Брэстам і Мінскам на буйным стратэгічным тракце Варшава — Масква. Яны не раз служылі полем бітваў і тэрыторыяй перамяшчэння вайсковых часцей. Калі нямецкая гістарыяграфія ў першую чаргу факусавала свой погляд на акупацыі з 1941 г., то для польскіх гісторыкаў у цэнтры ўвагі былі страта *крэсаў* у 1939 г. ды саветызацыя ў перыяд да лета 1941 г. Але да гэтага часу не было даследаванняў, якія прасачылі б працэс гарызантальна ад пачатку Другой сусветнай вайны да паўторнага захопу тэрыторыі Чырвонай арміяй. Але ж такі спосаб даследавання — немінучы, калі глядзець не толькі вачамі акупантаў, але і ўлічваць таксама бачанне насельніцтва пад акупацыяй.

Мэтай гэтай працы якраз і ёсць запаўненне наяўнага прагалу. Аляксандр Бракель вырашыў ажыццявіць лакальнае даследаванне, якое дае магчымасць атрымаць дэталёвае і шматпланавае ўяўленне. Побач з успрыняццем акупантаў на тэрыторыі Баранавіччыны тут даследуюцца розныя формы прыстасавання, калабаранцтва і супраціву. Аўтар разглядае пытанне, як ідэалагічныя высілкі савецкіх і нямецкіх уладароў уздзейнічалі на будні насельніцтва і якім чынам фарміравалася панаванне СССР ці, адпаведна, Германскага рэйху.

У першай частцы разглядаецца пытанне, які водгук на месцах знайшлі канцэпцыі абыходжання з нацыянальнасцямі. Этнічная мяшанка з вялікімі часткамі польскага і беларускага, ды і яўрэйскага насельніцтва магла стаць прычынай канфліктаў і ўзброеных сутычак паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей. Аднак аналіз паказвае, што, хаця канфлікты і здараліся часта, іх прычына вельмі рэдка палягала ў нацыянальных супярэчнасцях. Агульнае непрыманне бальшавікоў нават прывяло ў 1939 г. да збліжэння варожых груп. І калі немцы з лета 1941 г. спрабавалі распаліць нацыянальнае саперніцтва, ім давялося прызнаць, што ярка акрэсленая свядомасць маецца толькі ў маленькай групы насельніцтва. Для вельмі вялікай — пераважнай — большасці *нацыя* і *этнас* не былі катэгорыямі, якія вызначалі мысленне і самаразуменне.

Другая частка кнігі даследуе памеры і матывы супрацоўніцтва мясцовых людзей з савецкімі ці нямецкімі ўладамі. Абодвум рэжымам удавалася набіраць супрацоўнікаў з насельніцтва, выкарыстоўваючы мяшанку з прываблівання і гвалту. Нават без ідэалагічнай прыхільнасці да камуністычнага ці нацысцкага ладу мясцовыя памагатыя рызыкавалі быць зблытанымі ў савецкія ці нямецкія злачынствы.

Па-трэцяе, Бракель даследуе розныя формы апазіцыйных настрояў і рэакцый. Хаця нездавальненне савецкімі акупантамі было шырока распаўсюджана, да 1941 г. не здарылася ўтварэння ўзброеных груп супраціўлення. З вясны ж 1942 г. зачасцілі напады невялікіх партызанскіх груп. Але, на думку аўтара, сапраўды шырокі партызанскі рух разгарнуўся толькі пад уплывам масавага вывазу людзей на прымусовыя працы ў Германію. Побач з савецкімі партызанамі на Баранавіччыне пачала дзейнічаць і «Армія Краёва».

У верасні 1943 г. пачалася сапраўдная вайна паміж гэтымі двума падпольнымі рухамі. Польскі нацыяналістычны бок быў заклапочаны тым, каб зберагчы Баранавіччыну для дэмакратычнай Польшчы і выкарыстаць распачатае нямецкае адступленне для сваіх мэт. З другога боку, камуністычныя падпольшчыкі пад кіраўніцтвам Масквы імкнуліся абвастрыць класавую барацьбу, каб праз забойствы і выгнанне прадстаўнікоў старой эліты палепшыць перадумовы для паўторнай — і канчатковай — саветызацыі Усходняй Польшчы. Як падчас гэтага канфлікту, так і ў барацьбе паміж партызанамі і акупацыйнымі ўладамі, насельніцтва трапляла паміж франтоў. Не толькі акупанты, але і партызаны звярталі на яго турботы мала ўвагі і ў любы час падпарадкоўвалі яго дабрабыт ваенным мэтам.

Ужо ў мінулых публікацыях Ваенна-гістарычная даследчая ўстанова (Militärgeschichtliches Forschungsamt) надавала асаблівае значэнне Цэнтральна-Усходняй і Усходняй Еўропе, як і лёсу тамтэйшага насельніцтва падчас дзвюх сусветных войнаў. Я ўдзячны аўтару Аляксандру Бракелю за яго грунтоўнае даследаванне, дзякуючы якому ён значна пашырыў рамкі гэтай тэмы. Кніга, якой я жадаю прыхільнага стаўлення з боку навукі і грамадства, працягвае серыю «Эпоха сусветных войнаў», якую выдае ВГДУ ў выдавецтве «Ferdinand Schöningh» (Падэрборн).

*Д-р Ганс Элерт*
Палкоўнік, кіраўнік Ваенна-гістарычнай даследчай установы